kuccja, Kalėdos [3, с. 248] бел. Koljady, Velykos [3, с. 732] бел. Velik, (у беларусаў гэтае свята называецца яшчэ Вялічка – **А.Л.**), Aspaža [3, с. 27] бел. Aspaža, (у Вілейскім раёне данае свята мае таксама назву Спажа – **А.Л.**).

Такім чынам, прыведзеныя намі прыклады з'яўляюцца сведчаннем таго, што беларуска-літоўскае ўзаемадзеянне і ўзаемаўплыў на працягу стагоддзяў у галіне традыцыйнай кухні былі вельмі значнымі. І калі сказаць шырэй, літуанізмы ў беларускай мове распаўсюджаны пераважна на беларуска-літоўскім памежжы, а таксама ў беларускіх дакументах 14-17 ст., якія датычацца тэрыторыі Літвы, іх больш, верагодна, у народных гаворках, чым у літаратурнай мове беларусаў. Беларусізмы ж часта сустракаюцца яку літаратурнай мове, так і народных гаворках нашых паўночна-заходніх суседзяў. Калі літуанізмы ў беларускай мове пашыраны ў такіх сферах дзейнасці чалавека, як сельскагаспадарчая, бытавая, сямейная, рыбная лоўля і некаторыя інш., то беларусізмы былі распаўсюджаны (і яшчэ ўжываюцца) у такіх галінах чалавечай дзейнасці, як бытавая, кулінарная, сямейная, будаўнічая, разумовая, рэлігійная і інш.

**Каментарыі:**

I. Гэтае слова ў даўнюю пару магло з'явіцца ў продкаў цяперашніх літоўцаў не без беларускага пасярэдніцтва, бо сярод усходнеславянскіх народаў беларусы найцясней былі звязаны з літоўцамі.

II. Сваю пасярэдніцкую ролю пры пранікненні слова kopūstai ў мову продкаў цяперашніх літоўцаў таксама маглі адыграць продкі сучасных беларусаў.

**Спіс літаратуры:**


1. Милюс, В. Пища и домашняя утварь литовских крестьян в XIX и начале XX в. / В. Милюс // Труды института этнографии им Н.Н. Миклуха-Маклая.- М.,1956.- Т. 32. С. 127-169.- (Новая серия).
2. Lietuvių kalbos enciklopedija.- Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidybos institutas, 2008.- 634 p.
3. Smoczyński, W. Słownik etymologicznyj ęzyka litewskiego / W. Smoczyński.- Wilno: Uniwersytet Wileński Wydział filologiczny, 2007. 798 s.



***Таццяна Мармыш***


## ДЗЯРЖАЎНЫ СПІС ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ: ДА ПЫТАННЯ МЕТАДАЛОГІІ АТРЫБУЦЫІ КАШТОЎНАСЦЕЙ

Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (Дзяржспіс) у дачыненні да нематэрыяльнай культурнай спадчыны (НКС) мусіць папаўняцца і развівацца, перадусім як сродак яе аховы. Аднак, на практыцы сёння відавочная нерэлевантнасць мэтаў, сродкаў і, галоўнае, – іррацыянальнасць вынікаў яго папаўнення і развіцця.

Гісторыя ўзнікнення дзяржаўных спісаў каштоўнасцей адсылае ў пачатак XX ст., калі ў 1926 г. Савет Народных Камісараў БССР зацвердзіў першы на тэрыторыі Беларусі спіс помнікаў культуры, узятых пад ахову. Гэты спіс, як і шэраг наступных (1950, 1953, 1957, 1988), тычыўся каштоўнасцей выключна матэрыяльнага характару. Непасрэдна ж Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь пачаў фарміравацца з моманту ўваходжання ў сілу Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» (1992). У 1995 г. у Дзяржспіс былі ўнесены першыя за яго гісторыю нематэрыяльныя каштоўнасці – 49 выяў гербаў беларускіх гарадоў.

На момант іх уключэння такая інтэрпрэтацыя НКС была правамернай, паколькі згодна з класіфікацыяй Закона 1992 г. існавалі два падвіды НКС – фіксаваныя і ўвасобленыя духоўныя каштоўнасці [1]. Гербы былі ўнесены ў Спіс як фіксаваныя каштоўнасці з лакалізацыяй у г. Мінску (асабісты архіў гісторыка А. К. Цітова). Затым у выніку зменаў і дапаўненняў 2007, 2009 і 2012 гг. Закон «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» (2006) пазбавіўся нормаў, звязаных з фіксаванай нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасцю і яе эталонам, наяўнасць якіх супярэчыла Канвенцыі аб захаванні нематэрыяльнай спадчыны (2003) – асноўнаму і пакуль адзінаму міжнароднаму нарматыўнаму рэгулюючаму дакументу, які рэгламентуе дзейнасць па захаванні НКС. Паводле Канвенцыі НКС выключна «жывая» і дынамічная спадчына, якая можа змяняцца, прыстасоўваючыся да новых умоў, таму меркаваць аб наяўнасці «эталона» такой каштоўнасці па логіцы Канвенцыі 2003 г. некарэктна. Таксама было ўдакладнена азначэнне нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, пад якімі сталі разумецца звычаі, традыцыі, абрады, фальклор, мова і яе дыялекты, змест геральдычных, тапанімічных аб'ектаў і твораў народнага, у тым ліку, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва [2]. Гэта вызначэнне, прынамсі, наблізіла дэфініцыю НКС да яе трактоўкі ў міжнародным праве, тым самым засведчыла пэўныя захады па імплементацыі Канвенцыі 2003 у нацыянальную практыку.

Значна перапрацаваны ў частцы нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей у параўнанні з варыянтам 1992 г. дзейсны Закон 2006 усё яшчэ мае пэўныя супярэчнасці з Канвенцыяй 2003 г., якая ім жа вызначаецца прыярытэтнай (п. 2. арт. 2), што ўплывае і на развіццё Дзяржспіса:

1) беларускае заканадаўства вызнае за прадмет аховы толькі ўключаныя ў Дзяржспіс элементы НКС. Але нават такі падыход часта праяўляе сябе фармальна. У гэтым палягае ключавая лакуна сістэмы аховы НКС



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусі. Канвенцыя падкрэслівае неабходнасць аховы нематэрыяльнай спадчыны з боку дзяржавы незалежна ад уключэння ў спіс (спісы);

2) мова па Канвенцыі 2003 г. не можа быць асобным элементам НКС, а служыць толькі інструментам, сродкам яе выражэння. Закон 2006 г. адносіць мову да нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей;

3) геральдыка, зыходзячы з беларускага закона, можа з'яўляцца нематэрыяльнай каштоўнасцю, што дастаткова спрэчна. Сэнсава геральдыка выбіваецца нават з агульнага шэрагу з'яў, што названыя як нематэрыяльныя ў дзеючым законе. Верагодна, яна была ўключана ў гэты шэраг, каб такім чынам легітымізаваць «нематэрыяльнасць» ужо існых у Дзяржспісе гербаў;

4) супярэчнасці назіраюцца і ў крытэрыях НКС, у прыватнасці, у крытэрыі «аўтэнтычнасць». Аўтэнтычнасць, як вядома, ёсць азначэнне сапраўднасці ў дачыненні да першакрыніцы. Аднак, выключная роўнасць першакрыніцы падаецца вельмі сумнеўнай, бо для НКС сутнасна важная жыццяздольнасць, якая a priori ўтрымлівае рэсурс адаптавання (=зменаў) праз самарэгуляцыю. Меркаваць пра старажытна-інварыянтны фармат ці «чысціню» тэматычнай культуры сёння ў агульным не выпадае праз змену функцый элементаў НКС, нівеляванне лакальных адрозненняў, змену мадэляў і каналаў перадачы, разрывы ў пераемнасці, камерцыялізацыю і дэкантэкстуалізацыю НКС, пашкоджанне экалагічнага модусу мыслення носьбітаў, трансфармацыю суб'ект-суб'ектных стасункаў паміж асобай, элементамі НКС і культурным ландшафтам і інш. Калі прытрымлівацца ідэалогіі Канвенцыі 2003 г., дзеянне прынцыпу «прэзумпцыі» аўтэнтычнасці (і ў гэтым кантэксце пэўная іерархічнасць у сістэме «аўтэнтычны / першасны – неаўтэнтычны / другасны») пры выяўленні, ідэнтыфікацыі і захаванні нематэрыяльнай спадчыны не настолькі вызначальная, як для матэрыяльных аб'ектаў (для якіх аўтэнтычнасць і цэласнасць маюць першаснае значэнне), бо кансервацыя НКС азначае стварэнне перашкодаў для ўнутранай самарэгуляцыі і самадастатковасці.

Своеасаблівую эскападнасць выяўляе знаходжанне ў Дзяржспісе як нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Брэсцкага Свята-Васкрасенскага храма імя 50-годдзя Вялікай Перамогі з брамай-званіцай. Матэрыяльны аб'ект мае катэгорыю «Б», што азначае: храм з'яўляецца нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасцю, якая поўнасцю або часткова аднаўлена (зафіксавана) на другасным матэрыяле ці адметная духоўная, мастацкая і дакументальная яго вартасць могуць змяняцца [2].

Прымаючы пад увагу безумоўнае значэнне гербаў як гістарычнай каштоўнасці, іх сувязі з генезісам гарадоў, Магдэбургскім правам, якое замацоўвала магчымасць мець уласны герб, трэба адзначыць, што іх наяўнасць на сённяшні дзень у «нематэрыяльнай» частцы Дзяржспіса супярэчыць «духу» Канвенцыі 2003 г. У сувязі з даволі значнымі зменамі падыходаў да вызначэння НКС у нацыянальным заканадаўстве, варта звярнуць увагу і на неабходнасць перагляду катэгарызацыі гербаў і храма, асабліва на фоне т. зв. аптымізацыі Дзяржспіса, якая пачалася ў 2014 г. і закранае пакуль толькі матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці. Магчыма разгледзець варыянт змены статусу гербаў на матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці, што па-сутнасці не паўплывае на іх падахоўны стан. У выпадку з храмам змена статусу немагчымая, бо архітэктурны аб'ект не валодае дастатковымі якасцямі, каб быць прызнаным матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасцю, у тым ліку і з-за даціроўкі пабудовы (1995).

Нетыповая сітуацыя ўзнікла адносна нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці «Творчасць М. В. Тарасюка, увасобленая ў творах народнага дэкаратыўна-прыкладного мастацтва (інсітная драўляная скульптура» (в. Стойлы Пружанскага раёна, Брэсцкай вобласці) у сувязі са смерцю на пачатку 2015 г. майстра, у якога не было вучняў. Паўстаў шэраг пытанняў, што апелююць да агульнатэарэтычнага гуманітарнага характару сутнасці НКС як сацыяльнага і суб'ектнага, залежнага ад суб'екта-носьбіта культурнага выказвання, і пагатоў праблем нарматыўнага парадку, знітаваных з правамоцнасцю знаходжання элемента ў Дзяржспісе. Ці будуць гэтыя пытанні вырашаны і якім чынам, пакажа час, аднак, цяпер можна сцвярджаць, што Закон 2006 г. не прадугледжвае падобнай калізіі, а Канвенцыя 2003 г. адназначна вызнае за НКС толькі «жывую» спадчыну з усталяванай трансмісіяй.

Сёння ў Дзяржспісе знаходзіцца 76 элементаў НКС, з іх 50 (гербы і царква) не адпавядаюць Канвенцыі 2003 г., астатнія ж 26 маюць наступнае размеркаванне па абласцях: Брэсцкая – 4, Віцебская – 1, Гомельская – 4, Гродзенская – 3, Магілёўская – 9, Мінская – 5. На працягу 2013–2014 гг. Беларуская рэспубліканская навукова-метадычная рада па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь прыняла рашэнне аб неабходнасці надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці яшчэ 24 элементам, але яны так і не атрымалі яго афіцыйна праз пастанову Савета Міністраў, як тое прадугледжана Законам 2006 г.

НКС – феномен інтэгратыўны паводле шэрагу паказчыкаў: сінкрэтызму складовых частак, комплекснасці семантычна-знакавага зместу і культурна-семіятычных кодаў, сувязі з матэрыяльнымі аб'ектамі, інтэгратыўнасці з пункту гледжання даволі спецыфічнага аспекта аўтарства – сумяшчэнне функцыі аўтара і выканаўцы пры кожным новым увасабленні ў жыццё: «аўтарам» НКС з'яўляецца той, хто ўвасабляе яе ў жыццё «тут-і-цяпер», яго носьбіт. Носьбіт НКС з'яўляецца кантактным звяном сацыякультурнага і натуральна-прыроднага пачаткаў праз эмацыянальную і дзейнасную сувязь паміж чалавекам і ландшафтам. Такая тапафілія акцэнтуе ўнікальнасць прасторы і ўнікальнасць самаактуалізацыі чалавека ў ёй, разуменне самабытнасці культурнага ландшафту ў якасці рэсурсу, найперш, лакальнага развіцця, з чаго вынікае праблематыка экалогіі культуры як погляду на сучасную культуру ў канатацыях з традыцыйнымі каштоўнасцямі, народнай культурай, гістарычнымі каранямі, культурным ландшафтам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як сума частак не можа быць меншай за цэлае, так і меры па ахове НКС мусяць быць роўнымі аб’екту, на які яны скіраваныя, а менавіта комплекснымі. Меры, што ўзгадваюцца Законам 2006 г. пры наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, ніякім чынам не ўпарадкаваныя (у адрозненне ад Канвенцыі 2003 г.), у рэальнасці маюць несістэмны характар і, як правіла, інстытуцыйна закранаюць толькі сферу культуры, трапляючы ў кампетэнцыю адпаведнага міністэрства, чаго відавочна недастаткова, каб наладзіць дзейсную сістэму аховы НКС. У працы з Дзяржспісам павінна быць пераадолена метадалагічная дылема паміж даволі новай інструментальна Канвенцыяй 2003 г. і ўжо звыклым падыходам да захавання НКС, зафіксаваным айчынным заканадаўствам.

**Спіс літаратуры:**


1. Об охране историко-культурного наследия : закон Респ. Беларусь от 13 нояб. 1992 г. № 1940-XII [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://pravo.levonevsky.org/bazaby/zakon/text40/index.htm. – Дата доступу : 24.03.2015.
2. Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь : закон Рэсп. Беларусь ад 9 студз. 2006 г. № 98-З [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://livingheritage.by/zakon%20ab%20achovie%20HKS.pdf. – Дата доступу: 24.03.2015.



***Уладзімір Трапянок***


## КАНАЛ «КУЛЬТУРА» ЯК ГАЛОЎНЫ ПАПУЛЯРЫЗАТАР МУЗЫЧНАГА ФАЛЬКЛОРУ НА СУЧАСНЫМ БЕЛАРУСКІМ РАДЫЁ

За амаль 90 гадоў існавання Беларускае радыё развілася да разгалінаванай структуры, у якую ўваходзяць Першы Нацыянальны канал, канал «Культура», радыё «Беларусь» (вяшчанне на замежжа) і дзве станцыі – «Сталіца» і «Радыўс-ФМ». Вяшчанне ў нашай краіне, накіраванае на ўсебаковае асвятленне падзей палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага і культурнага жыцця Беларусі, пачалося ў лістападзе 1925 года. Перадачы мастацкай накіраванасці і зместу амаль з першых дзён занялі пачэснае месца ў эфіры адзінай на той час радыёхвалі. Літаратурныя і музычныя выпускі, падрыхтаваныя супрацоўнікамі радыё, служылі духоўнаму ўзбагачэнню нацыі так званай «гарадской» культурай, ліквідацыі непісьменнасці насельніцтва і распаўсюджванню лепшых узораў мастацтва. Адводзілася месца і фальклору. У прыватнасці, у 1928 годзе па радыё перадалі ўрыўкі са спектакля «Чорт і баба», прасякнутага народным гумарам і міфічнымі персанажамі. Трансліраваліся ў эфіры музычныя ўзоры фальклорнай спадчыны: запісаныя аўтэнтычныя творы, апрацаваныя песні і мелодыі, кампазіцыі на аснове фальклору. Знакавым у распаўсюджванні і папулярызацыі музычнай часткі народнага мастацтва на Беларускім радыё можна лічыць 1972 год, калі пачала выходзіць цыклавая перадача «Радыёклуб «Фальклор», аўтарам якой была Т.Варфаламеева. Да гэтага Т.Варфаламеева і З.Мажэйка стваралі асобныя праграмы, прысвечаныя музычнаму аўтэнтычнаму скарбу. З 1978 года вядучай «Радыёклуба «Фальклор» стала музыказнаўца Т.Песнякевіч. Аўтарамі зроблена велізарная праца па збіранні фальклору і захаванні яго для нашчадкаў: даследчыкі ездзілі ў экспедыцыі, запісвалі носьбітаў фальклорнай спадчыны, рыхтавалі для эфіру атрыманы матэрыял, здавалі яго ў фонды Беларускага радыё. У 2003 годзе перадача «Радыёклуб «Фальклор» пачала называцца «Час фальклору», у 2005 годзе набыла найменне «Галасы стагоддзяў». Праграма, якую працягвала ствараць Т.Песнякевіч (сумяшчаючы журналістыку з працай у сакратарыяце Саюза кампазітараў Беларусі і прадзюсарствам [1]) праіснавала да 2014 года. Пасля з прычыны зменаў у вяшчальнай палітыцы Першага Нацыянальнага канала яе закрылі. Традыцыя папулярызацыі непаўторнай музычнай часткі беларускага самабытнага мастацтва на самым даступным для краіны радыёканале перарвалася.

У 2002 годзе ў радыёпрасторы Беларусі з’явіўся канал «Культура», галоўнай задачай якога была вызначана папулярызацыя нацыянальнай і сусветнай культуры. Адну з першых перадач, прысвечанх музычнаму фальклору, назвалі «Гасцінец». Аўтарам ідэі выступіла Т.Песнякевіч. У напаўненні выпускаў выкарыстоўваліся фондавыя і арыгінальныя запісы народнай музыкі. З часам у межах перадачы пачала гучаць народная і аўтарская песня, што пазбавіла праект выключнай прыналежнасці да аўтэнтыкі.

У пачатку верасня 2012 года на канале «Культура» адбылася прэм’ера перадачы «Беларуская этнафонія». Аўтарам праекта і вядучай з’яўляецца выпускніца Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі па спецыяльнасці «музыказнаўства-беларусістыка» Аляксандра Макарэвіч. Ідэя гэтай перадачы заключаецца ў папулярызацыі музычнага аўтэнтычнага фальклору (вакальныя, інструментальныя творы) і прэзентацыі трансфармаваных узораў музычнай спадчыны. Перадача будуецца на выкарыстанні архіўных і арыгінальных запісаў Белтэлерадыёкампаніі, прыватных аўдыяфондаў знаўцаў і аматараў фальклору, аўтэнтычных матэрыялаў, сабраных падчас экспедыцый спецыялістамі і навукоўцамі Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусі, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і інш. Слухачы таксама маюць магчымасць пачуць разнастайныя інтэрпрэтацыі музычнага фальклору ў запісах удзельнікаў беларускіх калектываў «Ветах», «Ягорава гара», «Этна-суполка», «Guda», «Калыханка» і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ